чэрвень 2020

**Тэкст дыктанта**
**для правядзення ўступных іспытаў у VIII клас**
**ДУА «Мінскае абласное кадэцкае вучылішча»**

## Народны каляндар

У кожнага народа спрадвеку вёўся свой каляндар, у якім з пакалення ў пакаленне перадаваліся мудрасць, веды, назапашаны жыццёвы вопыт. Мелі такі каляндар і беларусы. Найбагацейшы духоўны свет нашых продкаў, іх надзвычайны талент, гумар адбіліся ў абрадах, звычаях, гульнях і песнях, якімі перасыпаны ледзь не кожны дзень гадавога кола. Працаўнік абапіраўся на бацькоўскія традыцыі, трымаў у памяці шматлікія парады і забароны, выказаныя трапным словам.

Шматвяковы вопыт, назапашаны многімі пакаленнямі папярэднікаў, быў для земляроба азбукай і граматыкай усяго яго жыцця. Перададзены ў спадчыну, ён дапамагаў арыентавацца ў з'явах прыроды, ад якіх нярэдка залежыў ураджай. У працэсе гістарычнага развіцця чалавецтва вучылася разумець мову прыроды, кіравацца яе падказкамі ў сваіх будзённых справах.

(110 слоў) Паводле У. Васілевіч